Наш Караткевіч

Янка Брыль

SHOUT
SHARE
IT

- Янка Брыль
  - 1
  - 2
  - 3
  - 4
  - 5
  -

Янка Брыль
Наш Караткевіч

1

Паслязаўтра год, як яго няма...

За маім расчыненым на ўсход акном, у пакоіку на гарышчы вясковага дома, застыла ў чаканні, можа, нарэшце, і сенакоснага дня сонечна-церпкая, росная раніца, асабліва прыгожая пасля зацяжных дажджоў. Над акном, у белацагляным вільчыку, пачырыквае ды шалпочацца ў цеснаватым ужо гняздзе ластаўчына малеча, падлёткі. З блізкага лесу зрэдку пачуецца гівал. Гэты голас Валодзя любіў. У слове пра маё пяцідзесяцігоддзе, успамінаючы наша падарожжа па маіх родных мясцінах, ён называў гэтага птаха двойчы і за пісьмовым сталом, чуючы яго песню, - «дзьме ў дудку з вадой». Час ад часу недзе воддаль гаркне варона, зімой і летам аднолькава, а ўсё ж, здаецца, сёння трошкі прыгажэй.

Во, і ластаўкі маладзенькія так ужо блізка - зляцелі з гнязда, паселі на белых фортках акна. Калупаюцца дзюбкамі ў новым перайку, прыхарошваюцца, змалку чысцюлі, зрэдку якая чырыкне штосьці, як і мама з татам, зусім даверліва, не баючыся чалавека. Бачу іх праз сетку фіранкі, няхай сабе менш выразна, але ж з жывымі ценямі, якія пацешна трапечуцца на ўзорыстай белі. Гэта тады, калі прылятае адно з бацькоў і насустрач чарговай мошцы ўся дзетвара адразу і галасамі, і крылцамі выказвае нецярплівасць.

Каб ён, Валодзя, наведаў мяне тут (а гаварылася ж!..), дык і заціхнуў бы разам у назіранні, а потым і засмяяўся б, па-свойму гучна ды молада, што акно цяпер шаноўнай панечцы гаспадыні прыйдзецца мыць часцей!..

Успамінаю словы яго, што ўразілі нядаўна, пры перачытванні шматпакутнай кнігі «Нельга забыць»:

«Прыйдзе дзень, і мяне не будзе. А свет не застанецца без слоў.

...Прыйдзе дзень, і мяне не будзе. Але будзе вечнай зямная цеплыня.

...А на цёплай зямлі ў буркатлівых галубоў лапкі ў векі вякоў будуць каралавымі».

Зусім інакш чытаецца гэта цяпер, чым чыталася вось ужо больш за дваццаць гадоў таму назад, у рукапісе.

Увосень васьмідзесятага я запісаў у блакноце:

«Думаў учора, што трэба будзе перачытаць Караткевіча, якога я чытаў найбольш у першых рукапісных варыянтах. І гэта па-свойму гаворыць мне пра яго значнасць. У нейкай залежнасці ад

яго юбілею».

Пасля, праз няпоўныя чатыры гады, прыйшла другая - горкая, балючая залежнасць. Жаданне перачытаць паўтарылася. За гэты год перачытаў амаль усё надрукаванае. (Найбольш - за гэтым столікам, на якім цяпер пішу.) У мностве папак, якія мы, сябры, сумна кажучы - члены камісіі па яго літаратурнай спадчыне, перабралі ў папярэднім азнаямленні, ёсць яшчэ нямала таго, што будзем не перачытваць, а чытаць упершыню. Асабліва блакноты з рабочымі запісамі зачараванага вандроўніка па самых розных кутках Беларусі, па ўсёй савецкай краіне і за межамі яе, з запісамі хатнімі, за перагружаным сталом. Уражанне ад таго, што ён паспеў зрабіць, як ён нямала зрабіў - пазней яшчэ пабольшыцца. Яно немалое і так, я гэта адчуваў над яго старонкамі неаднойчы. І мне з ім добра было, нібы з жывым гаворачы...

Інакш загучалі і пісьмы Валодзевы, паўсотні пісем з Воршы, з Масквы, з Рагачова. І мае да яго таксама перачыталіся цяпер інакш. І аўтографы на кнігах таксама гучаць па-іншаму. Хоць бы такі, апошні на тытульнай старонцы «Чорнага замка Альшанскага»:

«Другу майму з год былых, цяперашніх і, спадзяюся, доўгіх яшчэ будучых...» Дата: «11 лютага 84 г.». За пяць месяцаў і чатырнаццаць дзён...

Днямі, яшчэ раз убачыўшы гэты аўтограф, успомніў словы Адама Багдановіча з яго ўспамінаў пра Максіма. Не памятаю іх у зусім дакладным гучанні, помніцца жаль, які і ў мяне кладзецца ў падобныя словы: «Не думаў я, што мне прыйдзецца пісаць пра цябе, а не наадварот...»

Леташні ліпень... Валодзя паехаў зноў на Палессе, у апошняе, скажам цяпер - у адчайнае падарожжа. Некалькі дзён перад гэтым, калі ён вярнуўся з Кіева, з юбілейнай сустрэчы выпускнікоў універсітэта імя Шаўчэнкі, а я «на дзянёк» прыехаў з вёскі, мы гаварылі па тэлефоне. Ён мне сказаў, што ў Кіеве яшчэ застаўся наш агульны друг, таксама былы «шаўчэнкаўскі» студэнт, Флёрыян Няўважны, вядомы польскі ўкраініст, шчыры, актыўны прыхільнік і нашай літаратуры. Знайсці яго можна зноў жа па сяброўскай лініі, цераз іх аднакашніцу, кіяўлянку Музу Сняжко. З гэтай мілай жанчынай, якую я пакуль што ведаю па расказах беларуса ды паляка і па голасе ў тэлефоннай трубцы, мы нямала пагаварылі пра нашага беларуса. Куды менш весела, чым сумна, заклапочана. І з Флёрыянам крыху пазней - таксама. Муза Яўгенаўна перадала мне *пасля* Валодзева фота, зробленае ёю ў Кіеве, у тым апошнім чэрвені. Ён быў зусім стары на сваім толькі пяцьдзесят чацвёртым годзе, стары і тужліва-зняможаны.

І здымак той, для мяне апошні, і гутарка па міжгароднім з

украінкай і палякам, і наша з Валодзем гутарка па тэлефоне менскім - усё было апошнім *нечакана.* Як яно, *такое,* было ўжо неаднойчы, як будзе і потым. Да нас, у нас, пасля нас...

Здарылася так, што ў тыя ліпеньскія дні я злёг у вёсцы ад нейкага віруса, дзён колькі ныў у нязвычна высокай тэмпературы, і жонка, вярнуўшыся з Менска, застаўшы мяне хворага, не адразу паведаміла пра страшнае. Гэта было пад вечар 27-га. А ў дзве гадзіны поўдня, яшчэ адзін, у пэўным прасвятленні, я ўключыў транзістар, узяў пасля Менска Варшаву, дзе якраз дванаццаць, і пачуў адтуль славуты кракаўскі «гейнал».

Хай мне прабачаць тыя, хто гэта ведае і сам, - сказаць трэба для тых, хто не ведае. «Гейнал» гэты, шчымліва прыгожы, глыбока гістарычны голас горна з акна высачэннай вежы Марыяцкага касцёла, гучыць на ўсе чатыры бакі свету кожную гадзіну. І кожны раз мелодыя яго абрываецца *недагукам.* На ўспамін пра тую татарскую стралу, што - па легендзе - упілася ў напружанае горла гарніста ў адзін з жахлівых для стольнага Кракава дзён 1241 года. Я гэты «гейнал», - хвалюючы, радасна-ўрачысты, з сямівекавым абрывам ў канцы, - ведаю яшчэ з тых даваенных, заходнебеларускіх дзён, калі і ў нашу хату маленькім і вялікім цудам прыйшоў чорны эбанітавы радыёпрыёмнічак з навушнікамі. Чуў яго потым і непасрэдна, у Кракаве, то знарок, то міжвольна спыніўшыся на прасторнай, гладка забрукаванай плошчы, з найбольшай сілай адзначанай тою плітой з надпісам, на месцы якое наш высакародны, палымяны зямляк Касцюшка, паўстаўшы на няроўную барацьбу, прысягаў сваю вернасць паняволенаму народу.

«Гейнал» гучыць, лунае з аднаго акна. Пасля чуваць завучана мерны крок гарніста, які няспешна ідзе да акна другога. Потым ён нясе свой урачысты голас да трэцяга, да чацвёртага...

Гэтак чуваць мне па радыё. Я слухаў, лежачы, і ўжо не першы раз успомніў, што туды, на тую касцельную вышыню - 222 крутыя прыступкі - да тых гарністаў аднойчы цудам, праз усе забароны, трапіў і беларус. І гэта быў вясёлы беларус, адзін з нашых найлепшых, калі не найлепшы апошнім часам знаўца сваёй і суседскай гісторыі. Не ведаю, чуў ужо ён тады ці не чуў, што гэты ж хмельна-вясёлы подзвіг зрабіў да яго вельмі дастойны польскі аптыміст і рызыкант паэт Галчыньскі, пан і таварыш Канстанты Ільдэфонс, высокай пробы слова якога Караткевіч ведаў і любіў. Ну што ж, з усмешкай думаў я, слухаючы песню горна, не важна, што быў папярэднік, - так ці так, а яно і ў нашага рызыканта зрабілася молада ў кожным узросце.

Бог мой, і гэта ўсё - думкі, усмешкі мае - было якраз у тыя хвіліны, калі за сто кіламетраў, у Менску, якраз пачалося

жалобнае развітанне. З тым, каго і я любіў, люблю, як дарагога, нялёгкага, светлага, незабыўнага брата...

Яшчэ праз два дні мне сказалі ўсё, паказалі газету з некралогам.

2

Пра нашу першую сустрэчу і знаёмства ён пісаў у згаданым ужо юбілейным «штрыхавым партрэце» пад назвай «Мой друг і мая зямля», назвай, якая тады, на старонках «Маладосці», здалася мне хоць і прыемнай, але залішне ўзнёслай. Што ж, па-ягонаму. На той, улетку 1955-га, нарадзе маладых пісьменнікаў я не быў, прыехаў з Нарачы, калі яна ўжо закончылася. Аднак да сустрэчы з Караткевічам паспеў пачуць пра яго, як пра найцікавейшага з маладых. А сустрэліся мы ў кнігарні, дзе ён здзівіў мяне і маладым, свабодна гучным беларускім голасам у размове з прадаўшчыцамі, і колькасцю купленых кніг, і сваім адметным выглядам высока-танклявага юнака, маладзейшага за свае, як потым стала мне вядома, дваццаць пяць.

Гадоў праз дваццаць, а то і больш, на адной з менш вясёлых сустрэч, я спытаўся ў яго, ці памятае ён таго ўкраінскага вясковага настаўніка, пачынаючага беларускага паэта, неацяжаранага, імклівага ў юначай захопленай чысціні, - ці добра памятае сябе з тых дзён, калі прыйшоў да ўражанага чытача першай кніжкай паэзіі, а неўзабаве і прозы, калі пісаў сябрам, і маладым, і старэйшым, поўныя і перапоўненыя гумарам, розумам, аптымізмам пісьмы, калі бываў у іх сем'ях жаданым, у кожны дзень святочным госцем?.. Не зазлаваў Валодзя ад гэтага няментарскага пытання, толькі пасумнеў ледзь не да слёз у вялікіх вачах, пачаў, як і ўсе мы, раздражнёна шукаць прычын перш за ўсё толькі звонку. Хоць і было тых вонкавых, «аб'ектыўных» прычын вельмі нямала, як на аднаго, няхай сабе і дужага.

Няўжо так было заўсёды і так заўсёды будзе, што некаторым з найбольш таленавітых трэба прабівацца да чытача з незвычайнымі цяжкасцямі ды перашкодамі, як потым акажацца - лішнімі і шкоднымі не толькі для носьбіта таго жывога агню, але і для сапраўднай літаратуры? Потым акажацца... А тое потым прыходзіць не толькі позна, але ж і запозна. І вінаватых як быццам няма...

Кнігу «Нельга забыць» вышэй я назваў шматпакутнай. Паміж яе часопіснай публікацыяй і першым асобным выданнем прайшло больш за дваццаць гадоў. Перачытваеш цяпер і дзіву даешся, чаго, за што, навошта чапляліся да кнігі адкрытыя ды закрытыя выдавецкія рэцэнзенты, куды глядзела само выдавецтва, чаму не больш настойліва змагалася за правы таленту пісьменніцкая грамадскасць? Раман «Каласы пад сярпом тваім», у якім з

дыстанцыі, пры перачытванні, яшчэ больш удзячна бачыцца ва ўсёй гістарычнай грунтоўнай эпічнасці яшчэ і чыстата, шчырасць захаплення, мудрасць высокай чалавечнасці, - раман гэты трэба было прабіваць згуртаванымі сіламі літаратараў і навукоўцаў. З няменшым націскам прабіванне ішло і ў Маскве, дзе ў адным шаноўным выдавецтве мне давялося пачуць, што Караткевіч, - аўтар двухтомных «Каласоў...», «Дзікага палявання караля Стаха», яшчэ некалькі ёмкіх аповесцей, многіх яркіх апавяданняў, вершаў, нарысаў, п'ес, - што Караткевіч, бачыце, «не дарос да асобнай кнігі»!.. Такога могуць дамагчыся крыкуны ды шаптуны, зайздроснікі ды «знаўцы»!.. Крыху пазней паэтычная аповесць, а то і паэма ў прозе - «Чазенія», першая Валодзева кніга прозы ў перакладзе на расейскую мову, пабіла ўсе шматгадовыя рэкорды па колькасці чытацкіх пісьмаў у выдавецтва «Молодая гвардия» і, дзякуючы гэтаму выданню на мове нашых братніх кантактаў, неўзабаве сіганула за Пірэнеі, да чытача іспанскага.

Тут дарэчы будзе згадаць, як добра, хутчэй, чым у іншых краінах, Караткевіч быў зразуметы, прыняты ў залатой, скарынаўскай Празе. Мне жыва помніцца гордае адчуванне сяброўскай, зямляцкай радасці, нябрыдкай зайздрасці, з якімі я прыняў з рук дырэктара выдавецтва «Svoboda» важкую, багата ілюстраваную таміну рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Раман гэты, як і «Дзікае паляванне...» і «Нельга забыць» (раней чым дома!) выйшлі ў Чэхіі ў дабротным, як ацэньваюць знаўцы, перакладзе - з арыгінала - нашага добрага і нястомнага друга Вацлава Жыдліцкага.

Цяжкасці, перашкоды... Усё такое ды падобнае трэба было пераносіць чуламу сэрцу, вострай сумленнасці, абражанай годнасці чалавека і мастака. Аднаму, у горкай самоце, з роднымі і сябрамі, дзе былі і мудрая падтрымка, і бездапаможнае спачуванне, і шкоднае перазахвальванне з застольных вуснаў спачувальнікаў не вельмі шчырых або проста і недалёкіх, а гэта ж і для моцнай, мэтанакіраванай натуры можа стаць згубным...

Валодзя быў моцны не толькі духам. Я бачыў, як ён нястомна плаваў у сваім рагачоўскім Дняпры, у Чорным моры пры васьмі-сямі градусах, мы з ім нямала пахадзілі па сцежках горных і нізінных. Рыбак, і летам, і зімой, надрэчны вогнепаклоннік; і ў мора хадзіў з рыбакамі як свой чалавек. Зацікаўлены, цягавіты, вясёлы ў сваёй дужасці - такі ён быў і, здавалася, будзе заўсёды...

А потым малады знаёмы медык ціха расказваў мне пра апошнія дні і гадзіны свайго пацыента, цану якому ведаў і ён. У Валодзі не было ўжо ні ціску, ні пульсу, а ён яшчэ ўсё гаварыў з дзяжурным доктарам. І гэта яшчэ раз сведчыць, наколькі дух нашай добрай надзеі заставаўся мацнейшым за цела, так заўчасна

зняможанае, загубленае навалай неабавязковай немачы.

Цяжка пра гэта гаварыць...

3

І я не мог. Два месяцы не мог пісаць далей пачатае. А вось перачытаў яго і захацелася сказаць:

Смейся, мой слаўны, і спявай, як мы смяяліся і спявалі, асабліва ў дарозе!

Трохі свайго я ўжо расцерушыў у надрукаваным (з апошняга - «Адкрытка» ў кнізе «Сёння і памяць»), мала сказаўшы пра Валодзеву шчырую, натуральную паэтычнасць, прастату і складанасць, дзіцячую схільнасць да смеху, часамі крыўдлівасць, таксама ледзь не дзіцячую, лёгкую ранімасць, што ніколі не затойвалася ў недастойнай помслівасці, пра яго юначы рамантызм і сталае высакародства, што пераходзіла сяды-тады ў крыху пацешнае рыцарства, як быццам ён пазычаў яго ў сваіх гістарычных герояў.

Пра некаторыя з нашых падарожжаў ён пісаў. З ім нялёгка спаборнічаць - столькі зоркага вока, вернай рукі, безагляднай свабоды і добрага сэрца ў яго то, здаецца, зашчодрых, то заскупых, аднак заўсёды яркіх, дакладных штрыхах.

У дарозе мы маладзеем, часамі нават дзяцінеем, ці што. Ад адчування свабоды, палёту ў новае, якога ў нас наперадзе - так верыцца - вельмі многа.

Стары, маўклівы шафёр, чалавек практычна-хітраваты, і Валодзева мама, таксама старая, інтэлігентная жанчына, маглі аднойчы, майскай ранняй раніцай, кожны па-свойму здзіўляцца, недаўмяваць, што гэта вычвараюць тры дарослыя пісьменнікі, едучы з Менска на многа дзён з намерам рабіць у гэтай самакамандзіроўцы штосьці сур'ёзнае?..

А быў такі намер, была такая задума. Утрох - Караткевіч, Барадулін і я - мы вырашылі наведаць разам родныя мясціны кожнага з нас, пабыць там столькі, каб потым можна было разам напісаць пра гэта. Разам... А можа, і не варта шкадаваць, што мы не напісалі тое ўтрох? Відаць, і не змаглі б як след. Чэхаў казаў пра сааўтарства, што нельга ўдвух іграць на адной скрыпцы, а тут жа нават утрох. Потым Валодзя збольшага напісаў, а мы з Рыгорам не. Аднак яно бясследна не прайшло для нас, для творчай памяці - тое цудоўнае падарожжа ў два прыёмы: на іх радзіме вясной 1965-га, на маёй - праз год.

А для пачатку мы ў машыне, сонечнай раніцай, на лёгкапахадной дарозе, спявалі, балбаталі і смяяліся. Былі і песні-імправізацыі. Скажам, на паскакушна-хлёсткую мелодыю «бульбы», якую, як вядома, вараць, параць і таўкуць, складалася

песня, новая, з жывымі героямі ды пацешнымі сітуацыямі, якая ў запісе, калі б я цяпер зрабіў яго, не гучала б так весела ды бяскрыўдна для некаторых сяброў і таварышаў рознага ўзросту і рангу, як бяскрыўдна, дасціпна гучала яна тады. Радасць палёту ў родную, новую красу, да новых людзей шукала выхаду, знаходзіла яго ў блазенскім рыфмаплётве, то разам, то на змену, ад кожнага па кветцы ды калючцы.

Весела ды цікава бывала і ў іншым складзе, у розны час. Утрох у машыне, з двума Ўладзімірамі, Караткевічам і Калеснікам (за рулём) - па маляўнічых прасторах заходняй Гарадзеншчыны; да гэтых трох дадаўшы Міколу Аўрамчыка - Пружанскі, Камянецкі раёны, маці-Белавежа; з Фёдарам Янкоўскім - у яго Клетным каля Глуска, у легендарнай Рудабелцы...

Дарогі, дарогі!.. І па зямлі, што «пад белымі крыламі», і па ўсёй нашай раздольнай неабсяжнасці.

Між іншым светла помніцца Магнітагорск, калі мы былі зноў на некалькі год старэйшымі, аднак і зноў шчасліва, радасна гатовымі амалоджвацца падарожжам, свежасцю песні і смеху. Ад велізарнай ямы, што зеўрае на месцы гары Магнітнай (гара пайшла ў асноўным на танкі і снарады Вялікай Айчыннай), ад палымяна-грымучых цэхаў славутага камбіната, ад цікавых, адказных сустрэч са сталяварамі, бібліятэкарамі, школьнай моладдзю, ад менш ды больш дымных, копатных кварталаў абапал ракі Ўрал, граніцы Эўропы і Азіі, гасцінныя гаспадары на выхадныя дні вывозілі нас у свае дамы адпачынку. Над Банным возерам, назва якога, па легендзе, паходзіць ад «банно-прачечного» прывала, які тут дазволіў свайму войску Пугачоў. У башкірскіх гарах, у тым Абзакаве, дзе было так беласнежна, белабярозава і сонечна, што маладзейшыя ды смялейшыя з нашай групы, - а першы, вядома, Караткевіч, - да пояса голыя загаралі... у сакавіку. Дзесяць пісьменнікаў, што дзесяць дзён знаёмілі магнітагорцаў з беларускай літаратурай, мы там былі, вядома, не адны, з гаспадарамі і гаспадынямі. І зноў жа - столькі смеху было, столькі песень! І нават сярод маладых ды маладзейшых за яго самым вясёлым, непасрэдным бачыўся, чуўся ён, Валодзя...

Дзень яго сумнай гадавіны быў сонечны, як спецыяльна пасля занудна-заложных дажджоў. Пасля соснаў і кветак над месцам яго спачыну, ужо за людным сталом, дзе многа, шчыра і цвяроза гаварылася пра таго, хто сапраўды *«быў, ёсць, буду»,* як сведчыць назва апошняй з падрыхтаваных ім самім кнігі паэзіі, адзін з яго найбліжэйшых сяброў, Адам Мальдзіс, з якім мы побач сядзелі, спытаўся ціха пасля майго выступлення:

- А пра той цвік ва ўспамінах вы скажаце?

Мы ціха засмяяліся... не, толькі ўсміхнуліся, нібы з *яго*

дазволу, ледзь не з *ім* разам, з нашым Уладзікам. Бо прыгадалі такое.

Нястомны падарожнік, замілаваны знаўца роднай даўніны, ён умеў акружаць сябе, сваё месца на свеце, свой дом і стол і кніжныя паліцы ўсім тым, што люба, што заўсёды гаворыць пра запаветнае, галоўнае.

Гадоў некалькі мы жылі па-суседску, за сцяной майго рабочага пакоя была яго сталовая, хутчэй гасцінная, густоўна і шчодра запоўненая рознай, дробнай і буйнейшай, даўніной. Разьба, карціны, чаканка, ліццё, шкатулкі, альбомы.

І вось аднойчы за сцяной у мяне пачуўся спачатку нібы асцярожны, але ўсё больш ды больш настойлівы стук малатка. У тым месцы, дзе гэты стук цэнтраваўся, на сцяне маёй пачаў прыкметна ўздрыгваць, напухаць, трэскацца пафарбаваны тынк. Кавалачак яго вось-вось мерыўся адваліцца. А потым, ад стуку таго, не вельмі ахвотна, а ўсё ж палез, пачаў вытыркацца даволі вялікі цвік!..

Першае, што я зрабіў, гэта гукнуў туды: «Эй, вы!» і на дадатак грукнуў у сцяну кулаком. Тады пайшоў да суседа. Маё «эй, вы!» сказалася як быццам у прадчуванні, што гаспадар там не адзін. І сапраўды - удвух, з Мальдзісам. Сабраліся прыладзіць на сцяне драўлянага, у блекла-светлых фарбах старадаўняга, касцельнага або каплічнага анёла. Для гэтага спачатку трэба было ўбіць цвік, прытым адпаведна надзейны.

Нічога не кажучы, я запрасіў майстроў да сябе. Перад маёй салатавай сцяной яны застылі ў недаўменні. Пасля даўгаватай мінорнай паўзы наш паважаны Адась Іосіфавіч, - і сапраўды паважаны за сваю плённую працу ў родным літаратуразнаўстве, за свае чалавечыя, таварыскія якасці, - здзіўленне выказаў першы. Даволі сімпатычна ды салідна прышапетваючы, са сваім, усюды абавязковым «перш-наперш», ён спытаўся глыбакадумна, з багатым вопытам архіўнага даследніка:

- Чаму ж ён, перш-наперш, лезе адтуль не вастрыём, а капялюшыкам?

Зрэшты, адразу прызнаюся: гэтага ён, здаецца, не сказаў, - гэта я ўбачыў у яго нязвычна разгубленым позірку, і потым, расказваючы пра здарэнне, так той позірк «агучыў».

Яшчэ больш разгублены быў паважаны Ладысь Сямёнавіч. Ну, зусім-зусім як малы, з поўнай дзіцячай верай у казачна-фантастычнае. Той Валодзя, які як часам здавалася, ведаў усё на свеце, паэт, празаік, драматург, публіцыст з трыма вышэйшымі асветамі, з зайздроснай памяццю і фантазіяй, з начытанасцю ўсебаковай і грунтоўнай.

І мне прыйшлося прызнацца, каб потым ужо ўтрох зарагатаць.

Гадоў некалькі перад гэтым, рыхтуючы кватэру да рамонту, я выдзіраў у сваім пакоі цвікі з-пад карцін, каб потым, на свежых сценах, павесіць іх інакш. Ёсць жа і ў гэтым нейкае задавальненне. Найбольшы цвік, які трымаў пейзаж у масіўнай раме, цягнуць я пабаяўся, каб не выдраць і глыбу тынку (а то і проста філасофія ляноты), і забіў яго на ўсю глыбіню. А потым ён гладка знік пад новай афарбоўкай. І трэба ж так - той цвік, што забіваўся пад анёла, трапіў якраз у мой падпольны, канец у канец, і мой палез - сусветна-гістарычна - капялюшыкам наперад.

4

З дому зноў хочацца ў дарогу - пішучы гэта цяпер. Там мы, хоць і суседзі, а былі, здавалася, бліжэй адзін да аднаго.

У семдзесят першым, зноў на маёй Міршчыне, мы неяк вырагаталі ў машыне і на сцежках яшчэ адзін намер: на гэты раз ужо не ўтрох, а ўдвух заіграць на адной літаратурнай скрыпцы. Я расказваў Валодзю сёе-тое з таго, што бывала, па-мясцоваму кажучы, «за польскім часам», і адно нам здалося прыдатным для сумеснай рэалізацыі.

Пры доме, дзе ў нашым мястэчку размяшчалася гміна (раней, па-расейску, воласць, а сёння, не раўнуючы, сельсавет), была адрынка, у якой стаяў конь і стаяла брычка, для пана-войтавага выезду, быў дрывотнік і яшчэ адно памяшканне, назваць якое так, як яно ў вёсках называлася, мне няёмка. Па-польску гаварылася «пака», па-расейску гэта «каталажка», а па-нашаму, па-вясковаму значна прасцей, такім адкрытым словам, да якога лёгка ладзіцца рыфма «свісцёлка», «гудзёлка», і, пашукаўшы, гэтак далей.

У гэтым, не надта раскошным закутку працоўная вёска адседжвала розныя штрафы, якіх тады было багата. З падаткам апазніўся, дзіця ў школу не ходзіць, плот не пабяліў - плаці або адседжвай. Што ж, гэта танней, чым плаціць, тым больш, калі няма чым, ды тады, калі з часам вальней, у познюю восень або зімой. Хлеба ў торбу і туды «да пакі», а па-свойму - у тую, таксама ж на літару «п...». Дроў пры гміне нямала, але парэзаць іх, пакалоць, скласці гуртам можна гуляючы. Двор падмесці - зусім не работа. А тады зноў ляжы, нават удзень, расказвай ці слухай, куры, калі курыш і ёсць што курыць, рэжся ў «дурня» або займайся «гукаспаборніцтвам», ад якога, дарэчы, і пайшла назва той сядзёлкі (яшчэ адна рыфма). Колькі там было перагаворана, перасмяяна! Як святамі, заслужана адпачываючы, сярод сваіх, свабодных ды ахвочых пасмяяцца. Я - можна сказаць, на жаль, - там ні разу не быў, іншыя расказвалі, у тым ліку старэйшы брат, што заахвоціўся «лепш не плаціць», і праз пяць дзён прыйшоў няголены і вясёлы.

Вось мы з Валодзем і задумалі ні больш ні менш, а цыкл пад назвай «Апавяданні з гміннай... гм, гм...». І не напісалі яго, як вядома, зноў разышоўшыся па сваіх, няхай сабе і зусім суседскіх, пакоях. Дарма, што ў дарозе мы столькі смяяліся на тую тэму, што ён неўзабаве напісаў мне на расейскім выданні «Чазеніі»: «...ад смяшлівага, як дзіця, - смяшліваму, як падлетак, ад гыгалы - гэгэкалу...» З улікам узросту і адпаведнай пашанай.

Сёлета напрадвесні, калі мы, камісія па Валодзевай літаратурнай спадчыне, разбіралі яго архіў, больш за сотню папак, на адной з іх я ўбачыў надпіс «Рассказы из каталажки», з падзагалоўкам «сценарий». Яшчэ адна яго, бясспрэчна ж таленавітая, аднак і беспаспяховая спроба дабрацца да розуму і сэрца нашай кінастудыі. Разбор архіва быў папярэдні, мне яшчэ трэба будзе, хочацца заглянуць у тую папку, як толькі прыйдзе нагода. А тады адразу падумалася пра той наш намер, які з майго боку ў пэўнай меры здзейснены «Ніжнімі Байдунамі».

Добра гэта, прыемна, але і трывожна - даваць таварышу сваё новае, свежанькі рукапіс. Калі я на працягу апошняга года перачытваў усё Валодзева ў кнігах, мне часта, здалёк усміхаліся, цёпла і сумнавата, тыя старонкі, перш за ўсё напісаныя ад рукі, чорна, дробна і акуратна запоўненыя яго працавітым почыркам, старонкі многія і заўсёды жывыя, якія ён прысылаў са сваёй настаўніцкай далечы, спачатку з кіеўскага сяла Лесавічы, потым з Воршы, а затым і з далечы стольнай, маскоўскай, з вышэйшых курсаў літаратурных і кінасцэнарных. Калі ж ён стаў менчуком, разам з рукапісамі пайшлі і машынапісы, што ўжо прыносіў сам. Старонкі паасобныя і папкі рознай таўшчыні ды кілаграмнасці. Хоць бы тыя самыя «Каласы...» - некалькі папак адразу. Мы ажно ўспомнілі словы бацькі-Багушэвіча: «Будзе і ў беларусаў ксёнжачка!..» Не раз і радаваліся ўступна, і віншаваліся потым, бо ён жа маё таксама чытаў, і спрачаліся, часам і рэзка, зноў разумнелі - усе дзеля галоўнага.

А з «Байдунамі» было так. Я даў яму рукапіс аднаму з самых першых. Іншыя прачыталі, пагаварылі са мной, а ён так доўга не аддаваў, што я пачаў і непакоіцца, падазраваць, нават нібы злавацца. Але не званіў, не заходзіў, асцерагаўся сустрэцца. Цярплівасць даволі прыкрая... Ды вось ён - нарэшце! - прыходзіць.

- Стары, - пачынае, не сеўшы, як вінавата стоячы сярод пакоя з папкай, - чатыры разы ўзапар чытаў...

Апраўдваецца ён з размашыстым сяброўскім пераборам, і мне крыху няёмка, і смешнавата, аднак я пачынаю спакваля і рассалоджвацца ад пахвалы, стараюся нібы абараняцца ад яе, ці то стрымана, ці то і збянтэжана мармычу:

- Ну і як?

Ён хваліць. Кажа, праўда, што «ніякая гэта не аповесць», але такое мне, між іншым, абыякава: што тут за жанр. Я чакаю ацэнкі, больш цвярозай і канкрэтнай, па галоўнай сутнасці, а ён, мне здаецца, не заўважае гэтага. Кажа:

- І маме прачытаў.

Зноў маё «ну, і як?». І яго - нечаканае:

- Іржала, стары, і качалася па падлозе.

Неадпаведнасць яўная! Салідная, па-старэчы прыгожая, хоць і нямоглая ўжо, з даўнім ухілам інтэлігентная, прыязна і разумна ўсмешлівая Надзея Васільеўна - і такое «іржала», «качалася»... Трэба сказаць пра гэта, да часу стрымліваючы ўсмешку, даць дакор маладзейшаму, аднак цікавасць перамагае.

- А грубасць яе не шакіравала?

Зноў нечаканае, з так добра і даўно знаёмым пафасам:

- Што ты, стары! Мы, арыстакраты, гэта любім!

Ах, Валодзя, Уладзік, Ладысь, - як гэта ўсё па-твойму звычайна, пацешна, міла! І тады было, і сёння - яшчэ больш...

5

Былі прыходы і іншыя.

Аднойчы ён да мяне пазваніўся, не тэлефонна, а ў дзверы, так позна, што можна было і ўстрывожыцца. Я адчыніў. Ціхутка, з калідора, цераз сталовую ў мой пакой. Зачыніліся.

- Што? - шапнуў я.

У руцэ яго была кніга. Палец закладзены паміж патрэбнымі старонкамі.

- Стары, паслухай.

Гэта быў том Талстога. «Хаджы-Мурат», кароценькі раздзел пра разбурэнне царскімі карнікамі чэркескага аула.

Чытаючы, і не вельмі прыцішана, Валодзя стрымліваўся ад усхліпаў, перапыняўся. Закончыў і, гледзячы на мяне вялікімі, поўнымі па-дзіцячы краплістых слёз вачыма, сказаў, як выдыхнуў:

- Стары, колькі ўсяго можна ім дараваць за такую праўдзівасць?!.

Ён праўдзівы і сам. Верыў у тое, што гаварыў. І ў жыцці быў праўдзівы, і ў творах застаўся. У творах - наколькі ўдалося...

Мы, хто блізка ведаў Валодзю, кожны патроху, кожны па-свойму раскажам пра яго, успамінаючы.

Рэшту скажа ён сам, сваімі кнігамі. З усёй сваёй раскошнай раскаванасцю, буйствам фантазіі, здольнасцю пранікаць у далёкае ў часе, ажыўляць яго ў людзях. Сплочванне нашых даўгоў перад роднай, так часта трагічнай гісторыяй, перад сапраўднай Літаратурай.

Беларусь даўно чакала такога пісьменніка.

І радасна, што ён прыйшоў.

І горка, балюча, што ён не змог, не паспеў разгарнуцца яшчэ больш глыбока і шчодра.

1985